УДК 811.161.3’373.215

Вуч. І.Д. Неаронаў
Навук. кір. А.І. Дашкевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Новалукомля”)

# ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ, ГРАМАТЫЧНЫЯ І СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЛІМНОНІМАЎ ЧАШНІЦКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

На тэрыторыі Чашніцкага раёна налічваецца 70 азёр. Нам стала цікава: чаму гэтыя азёры маюць менавіта такія назвы? Што гэтыя назвы могуць нам расказаць аб мінулым нашага краю, якія моўныя асаблівасці ў іх праявіліся?

Мы выказалі гіпотэзу, што, магчыма, у большасці назваў азёр Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці адлюстраваны іх прыкметы і прыродна-геаграфічныя асаблівасці навакольнага ландшафту. Таксама назвы могуць быць звязаны з адносінамі азёр да іншых геаграфічных аб’ектаў, чалавекам і яго дзейнасцю.

Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што ў ім ажыццеўлена спроба сістэматызаваць, растлумачыць і захаваць паходжанне назваў азёр Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.

**Мэта працы**: правесці лексіка-семантычны, граматычны і словаўтваральны аналіз назваў азёр Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Падчас даследавання было зафіксавана 41 возера. Для іх наймення выкарыстоўваецца 40 назваў.

У выніку лексіка-семантычнага аналізу лімнонімаў было выяўлена, што ў аснове назваў большай часткі вывучаных аб’ектаў ляжаць іх прыкметы або прыродна-геаграфічныя ўласцівасці наваколля (асаблівасці рэльефу, характар глебы, памер, глыбіня, адлегласць і інш.) Было выяўлена 19 такіх лімнонімаў: Дрэвічнае, Квецена і інш.

Другое месца займаюць лімнонімы, утваральныя асновы якіх указваюць на іх месцаразмяшчэнне ў адносінах да якога-небудзь іншага аб’екта (13 лімнонімаў): Болюцкае, Вядрэнскае, Гілянскае і інш.

Найменшую групу складаюць аб'екты, назвы якіх звязаны з чалавекам і яго дзейнасцю (8 лімнонімаў): Баярскае, Жаночае і інш.

Граматычны аналіз паказаў, што ўсе вывучаныя намі лімнонімы адносяцца да простых. 100% простых лімнонімаў маюць форму адзіночнага ліку. 29 з іх (73% ад агульнай колькасці) адносяцца да прымет- нікаў адзіночнага ліку ніякага роду.Таксама сустракаюцца

лімнонімы, якія адносяцца да назоўнікаў мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Яны складаюць 8%, 10% і 10% адпаведна ад агульнай колькасці.

Простыя лімнонімы ў залежнасці ад асаблівасцей словаўтварэння падзяляюцца на невытворныя і вытворныя [3, с.198].

На вывучанай тэрыторыі група невытворных лімнонімаў нязначная. Было выяўлена 10 назваў, што складае 25% ад агульнай колькасці. Найбольшую колькасць сярод невытворных лімнонімаў складаюць назвы, якія ананімічны субстантаванаму поўнаму якаснаму прыметніку ў ніякім родзе. Было выяўлена пяць такіх лімнонімаў (12,5% ад агульнай колькасці): Белае, Жаночае, Мелкае, Святое, Чорнае. Таксама мы выявілі чатыры лімнонімы, якія ўтварыліся семантычным спосабам на аснове апелятываў. Іх назвы адпавядаюць назоўнікам ў жаночым (5%) і мужчынскім (5%) родзе: Галаўня, Чамярыца, Слідзец, Сцержань. Яшчэ адзін лімнонім (2,5%) быў утвораны семантычным спосабам на аснове айконіма, каля якога ён знаходзіцца: возера Павулле.

Адметнай рысай вытворных лімнонімаў з'яўляецца наяўнасць у іх тапанімнага фарманта, (прыстаўка, суфікс, флексія). Большасць такіх лімнонімаў на тэрыторыі Чашніцкага раёна былі ўтвораны суфіксальным спосабам. Было зафіксавана 29 назваў, што складае 73% ад агульнай колькасці.

Лімнонімы, утвораныя прэфіксальным спосабам, прадстаўлены невялікай колькасцю. Быў зафіксаваны толькі адзін лімнонім (2,5 %): Зазерыца.

**Заключэнне.** Такім чынам, у працэсе працы гіпотэза, пастаўленая ў пачатку даследавання, пацвердзілася поўнасцю.

Мы сістэматызавалі атрыманы матэрыял. На яго аснове быў складзены слоўнік «Назвы лімнонімаў Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці», а таксама распрацавана мабільнае прыкладанне «Азёры Чашніччыны».

Матэрыялы даследавання будуць садзейнічаць пашырэнню ведаў пра тапаніміку Чашніцкага раёна, стануць дадатковым инфармацыйным матэрыялам, які можна выкарыстоўваць на ўроках мовы і літаратуры, гісторыі, геаграфіі, на занятках гурткоў і факультатываў, класных і інфармацыйных гадзінах.